**2 лютага 2024 г. – 530 гадоў з дня нараджэння Боны Сфорца (1494-1557), вялікай княгіня Вялікага Княства Літоўскага, каралевы Польшчы, другой жонкі вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта І Старога**



Бона Сфорца д’Арагона нарадзілася 2 лютага 1494 года ў Віджэвана (Італія) у сям’і міланскага герцага. Багацце і ўлада з самай калыскі вызначылі лёс дзяўчынкі. Яе адукацыя была ўсебаковай: ведала права, геаграфію, латынь, тэалогію, філасофію, матэматыку. Сустракалася з вялікім Леанарда да Вінчы, які працаваў у палацы яе бацькоў Джавані-Галеаца Сфорца і ўнучкі неапалітанскага караля Фердынанда І Д'Арагона Ізабелы.

18 красавіка 1518 года стала другой жонкай караля Польшчы і вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага Жыгімонта І Старога. Закаханы Жыгімонт называў жонку «найяснейшай паннай» і надзяляў яе незлічонымі ўладаннямі.

Каралева Бона - адна з самых неадназначных фігур у беларускай гісторыі. Яна стала каралевай у 24 гады і ўвайшла ў гісторыю як неардынарная і ўладная асоба, якая шмат карыснага зрабіла для беларускіх земляў. На беларускім Палессі Бона рабіла спробы меліярацыі, пачала аграрную рэформу — валочную памеру. Па яе ініцыятыве будаваліся замкі і касцёлы, лячэбніцы і школы, млыны і грэблі, узнікалі новыя паселішчы. Перспектыўныя мястэчкі атрымлівалі Магдэбургскае права.

Бона Сфорца імкнулася павялічыць палітычную ўладу караля і вялікага князя шляхам умацавання яе эканамічнай асновы. Яна значна пашырыла зямельную ўласнасць дынастыі Ягелонкаў, абараняла дзяржаўныя землі ад незаконнага прысваення іх феадаламі. Як ні дзіўна, але Бона выступала супраць уніі Польшчы і ВКЛ. Хоць за гэтым стаяла асабістая выгада: яна не хацела са сваіх шматлікіх уладанняў у Вялікім Княстве (у тым ліку Кобрынскай воласці ў Берасцейскім павеце) плаціць падаткі ў польскую казну. Каралева і вялікая княгіня садзейнічала асваенню сялянамі лясоў і ператварэнню іх у сельскагаспадарчыя ўгоддзі, узнікненню некаторых населеных пунктаў на Беларусі.

У гады праўлення каралевы Боны надыходзіць роскві многіх беларускіх гарадоў. З яе імем звязаны многія культурныя і тэхнічныя дасягненні ў ВКЛ, цывілізаваныя змены ў пабытовай культуры: машчэнне гарадскіх вуліц і плошчаў, вадаправод і ратушны гадзіннік у Гародні і інш. Пры яе падтрымцы ў 1523 годзе ў Кракаве была выдадзена паэма Міколы Гусоўскага «Песня пра выгляд, лютасць зубра і паляванне на яго», першы рэалістычны ліра-эпічны твор пра нашу краіну.

Дзейнасць каралевы Боны праходзіла галоўным чынам на тэрыторыі ВКЛ, актыўна пачалася ў 1521 годзе, калі пасля смерці пінскага князя Фёдара Іванавіча яго велізарныя ўладанні перайшлі ва ўласнасць вялікага князя. Ёй былі перададзены княствы Пінскае, Гарадзецкае (Давыд-Гарадоцкае), Кобрынскае, Клецкае, воласць Рагачоўская і шэраг іншых зямель. Свае ўладанні каралева павялічыла, нейкія маёнткі выкупіла, пастаянна судзілася за землі, выйграла многа працэсаў.

Выдатна адукаваная, яна імкнулася зрабіць з Жыгімонта І абсалютнага манарха не толькі ў палітычных, але і ў фінансавых адносінах. Павелічэнне асабістай уласнасці двара стала адным з галоўных клопатаў каралевы Боны. Вядома, каралю даводзілася спачатку абмяжоўвацца ўнясеннем паправак у выдадзеныя раней прывілеі. Напрыклад, права на валоданне Кобрынам Вацлаву Касцевічу было захавана, аднак указвалася, што пасля яго смерці ўладальніцай Кобрынскага староства стане Бона. У 1532 годзе пасля смерці каралеўскага маршалка Касцевіча каралева спрытна распарадзілася ўсёй рухомай і нерухомай маёмасцю на кобрынскіх землях. Яна выкупіла маёнткі, якія належалі іншым феадалам, і аб’яднала гэтыя разрозненныя ўладанні, стварыўшы такім чынам маналітную адміністрацыйную і эканамічную адзінку. Так Кобрынскае староства стала поўнай уласнасцю караля (дакладней, самой Боны) і ў якасці павета ўвайшло спачатку ў склад Падляшскага, а потым у 1566 годзе Берасцейскага ваяводстваў.

З 1532 года фактычна ўзнікла Кобрынская эканомія. У яе склад уваходзіла тры горада – Кобрын, Дабучын (Пружаны) і Гарадзец, пад упраўленнем якіх знаходзілася шэсць валасцей: Кобрынская, Чаравачыцкая, Вежацкая, Дабучынская, Блудзенская і Гарадзецкая; восем фальваркаў, 98 вёсак.

На сваіх землях Бона клапацілася аб культуры земляробства, уводзіла новыя віды і спосабы апрацоўкі зямель. Часта наведвала свае маёнткі, не спадзяючыся на аканомаў, сама ўнікала ў дробныя дэталі і падрабязнасці. Некалькі разоў яна прыязджала і ў Кобрын. Менавіта ў гады праўлення каралевы Боны надыходзіць росквіт многіх беларускіх гарадоў, у тым ліку і Кобрына. Тут актывізаваліся горадабудаўнічыя работы, была прыведзена ў парадак замкавая служба. Клапоцячыся аб павелічэнні даходаў, Бона заахвочвала развіццё земляробства, гандлю, рамёстваў. Яна праяўляла клопат аб чысціні належачых ёй пасяленняў. Бона загадала будаваць дамы «пад шнур» і стварадь праекты будаўніцтва і добраўпарадкавання горада.

Правядзенне зямельнай рэформы і засяленне раней неабжытых зямель запатрабавала правядзення меліярацыйных работ. Верагодна, тады ж пачаліся і першыя меліярацыйныя работы паблізу Кобрына. Так, была зроблена спроба асушыць балота на поўдзень ад Кобрына. Але самым удалым меліярацыйным мерапрыемствам Боны стала пракладка канала, названага ў яе гонар. Канал даўжынёй 34 км, які стаў правым прытокам ракі Мухавец, пачынаецца каля вёскі Завора (Маларыцкі раён), далей праходзіць па тэрыторыі сённяшняга Кобрынскага раёна і трапляе ў Днепроўска-Бугскі канал у Кобрыне. Да нашага часу канал, які цячэ праз паўднёва-заходнюю ўскраіну горада, называецца Бона (у мінулым канал каралевы Боны). Канал функцыянуе і сёння, ён паказаны на сучасных тапаграфічных картах.

І яшчэ адно каштоўнае пачынанне звязана з імем гэтай энергічнай каралевы. Пры ёй у практыку ўвайшло правядзенне дзяржаўных інвентарных (статыстычных) абследаванняў – так званых рэвізій. Даныя, якія збіралі рэвізоры і камісары, павінны былі адыграць важную ролю ва ўпарадкаванні гаспадаркі ў каралеўскіх уладаннях. У Кобрыне і старостве першая рэвізія была праведзена ў 1549 годзе. Дакументы гэтых абследаванняў малююць даволі дэталёвую карціну сацыяльна-эканамічнага жыцця горада ў другой палове XVI стагоддзя.

Уплыў каралевы Боны быў сапраўды дзіўным: дзяржава жыла без хваляванняў і ўзрушэнняў, без уціску і апантанасці рэлігійнага фанатызму, у той час, як на Захадзе палалі кастры інквізіцыі.

Вясной 1548 года Жыгімонт I Стары памёр, улада перайшла да сына Боны Жыгімонта (Сігізмунда) II Аўгуста (1520–1572), які дабіўся каранавання жонкі Барбары з Радзівілаў. Аднак Барбара ў 1551 годзе раптоўна захварэла і памерла. З-за непаразумення з сынам Бона вырашыла пакінуць Польшчу і вярнуцца на радзіму, у Італію. Загады каралевы па маёнтках на Палессі цягнуцца да 1556 года, пасля чаго маёнткі Боны перайшлі да яе сына Жыгімонта II Аўгуста .

У лютым 1556 года каралева выехала ў Італію, вывезла з сабой шмат каштоўнасцей - вялізныя сродкі, якія нагадвалі казну цэлай краіны. Пасялілася ў Неапалі, пазычыла каралю Філіпу II 430 тысяч залатых дукатаў. 19 лістапада 1557 года Бона Сфорца раптоўна памерла, верагодна, атручаная па загаду караля Іспаніі Філіпа II, вядомага сваёй жорсткасцю. Польскія каралі на працягу двух стагоддзяў прад'яўлялі італьянскім манархам патрабаванні аб вяртанні пазыкі, але безвынікова. Багацце, сабранае на Беларусі ў выніку феадальнай эксплуатацыі народа, не паслужыла для развіцця беларускага краю, а было вывезена ў далёкае замежжа.

Пахавана каралева Бона ў Бары ў базыліцы Святога Мікалая. Надмагілле, заказанае яе дачкой Ганнай Ягелонкай, захавалася да нашых дзён. Каб замацаваць памяць пра сваю вялікую маці, Ганна Ягелонка загадала надаць былому ўладанню Боны - Пружанам - магдэбургскія прывілеі і статус горада, герб якога вельмі нагадвае міланскі радавы герб Сфорцаў.

На Кобрыншчыне памяць аб каралеве Боне жыве не толькі ў назве канала. Яе імя носіць творчае аб'яднанне мастакоў Палаца культуры – «Галерэя "Bona Sforza"». Мясцовы мастак Сяргей Касцюк адлюстраваў каралеву алейнымі фарбамі на палатне і падараваў гэтую карціну ваенна-гістарычнаму музею імя А. В. Суворава.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай
цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Спірыдонаў, М.** Бона Сфорца / Міхаіл Спірыдонаў // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1996. - Т. 1. – С. 211–212.

**Спірыдонаў, М. Ф.** Бона / М. Ф. Спірыдонаў // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1970. - Т. 2. - С. 368–369.

**Спірыдонаў, М.** Бона Сфорца / Міхаіл Спірыдонаў // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. - Мінск, 2005. - Т. 1. – С. 337.

**Спірыдонаў, М. Ф.** Бона Сфорца / М. Ф.Спірыдонаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1994. - Т. 2. - С. 55–56.

**Аудерская, Г.** Королева Бона : исторический роман-хроника / Галина Аудерская. - М. : Радуга, 1989.- 512 с.

Упоминается г. Кобрин - см на с. 360-361.

**[Бона Сфорца]** // Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2008. – Т. 2. Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. - С. 261,267,300,350.

**Бутэвіч, А.** Хто каго труціў : [Барбара Радзівіл, Бона Сфорца] / А. Бутэвіч // Таямніцы Нясвіжскага замка / А. Бутэвіч. - Мінск, 2013. – С. 149-156.

**Казлоў, Л. Р.** Бона Сфорца / Л. Р. Казлоў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 46–47.

**Дранько-Майсюк, Л.** Кветкавы край Беларусі / Леанід Дранько-Майсюк, Анатоль Кляшчук. – Мінск : Паліграфкамбінат, 2020. – 370, [5] с. : іл. – (Зберагчы роднае).

Гл. на с. 19–27.

**Дранько-Майсюк, Л.** Каралева Бона любіла мёд : [верш] / Леанід Дранько-Майсюк // Кніга для спадарыні Эл : проза, вершы, п’еса / Леанід Дранько-Майсюк. - Мінск, 2012. - С. 108.

**Дучыц, Л.** Каралева Бона / Людміла Дучыц, Ірына Клімковіч // Сакральная геаграфія Беларусі / Людміла Дучыц, Ірына Клімковіч. – Мінск, 2011. – С. 312-314.

**Ермаловіч, М.** Зноў напады і прымірэнні : [Бона Сфорца] / Мікола Ермаловіч // Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае / Мікола Ермаловіч. – Мінск, 2003. – С. 300-301.

**Кириллова, Н. М.** Канцелярский лист королевы польской и великой княгини литовской Боны Сфорца в собрании Брестского областного краеведческого музея / Н. М.

Кириллова // Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання. - Брэст, 2019. - С. 53–58.

**Курков, И.** Королева по призванию : [Бона Сфорца] / Илья Курков // Брестчина: легенды, события, люди / Илья Курков. - Минск, 2005. - С. 47–49.

**Ландина, Л. В.** Бона Сфорца: великая княгиня литовская и королева польская / [Л. В. Ландина]. – Минск : Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2020. – 32 с. – (Имя в истории Беларуси).

**Мартинович, А. А.** Нежность звёздного неба: историческая повесть /Алесь Мартинович. – Минск: Літаратура і мастацтва, 2011. – 240 с.

**Чаропка, В.** [Бона Сфорца] / Витовт Чаропко // Великие князья Великого Княжества Литовского / Витовт Чаропко. - Минск, 2013. - С. 230-233.

**Беларускі каляндар, 2024 год. Бона Сфорца** // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. - 2023. - № 8. - С. 8 (дадатак).

**Ландина, Л.** Дочь своей эпохи : Бона Сфорца — королева польская и великая княгиня литовская (1494–1557) / Лариса Ландина // Гаспадыня. - 2019. - № 12.- С. 44–45.

**Фридлендер, Н.** Бона Сфорца — кто она? : к 500-летию начала правления королевы / Наталья Фридлендер // Кобрин-информ. - 2018. – 25 октября (№ 43). - С. 4.

**Шарапаў, У.** Рэнесансавая культура ў ВКЛ у першай палове XVI ст. / Уладзіслаў Шарапаў // Беларускі гістарычны часопіс. - 2017. - № 2. - С. 47–53.

Асаблівасці Рэнесансу на беларускіх землях, ёсць некаторыя новаўвядзенні Боны Сфорца на землях ВКЛ.

**Мяцеліца, К.** Італьянская змяя : [Бона Сфорца] / Кірыл Мяцеліца // Маладосць. - 2016. - № 10. - С. 142–143.

**Павловский, Б.** «Змея» на троне / Борис Павловский // Вечерний Брест. - 2012. – 2 марта (№ 18). - С. 8.

О королеве Боне Сфорце.

**Выпрабаванне** вайной, няволяй і … каханнем // Женский журнал. – 2011. - №11. - С. 60-61.

Аб Боне Сфорца і яе дочках.

**Дзярновіч, А.** Бона Сфорца і Кацярына Медычы. “Чорная” легенда італьянцаў у Еўропе XVI стагоддзя / Аляксандр Дзярновіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2011. - № 11. – С. 14-17.

**Масляніцына, І.** Каралева Палесся / Ірына Масляніцына // Женский журнал. - 2011. - № 2. - С. 58–59.

Біяграфічныя сведкі аб каралеве Боне Сфорца.

**Рысь, Е.** Рачительная хозяйка кобринской экономии : [Бона Сфорца] / Елена Рысь // Кобрин-информ. - 2010. - 26 августа. - С. 6.

**Скеп’ян, А.** Уладарная Бона / Анастасія Скеп’ян // Мастацтва. - 2010. - № 1. С. 54–55.

**Вайткун, А.** Каралева Бона: міфы і рэальнасць / Аляксей Вайткун // Народная газета. – 2009. – 21 студзеня. – С.13.

**Бона Сфорца**, прекрасная королева // Кобрин-информ. – 2009. - 16 апреля. – С. 26.

**Гулецкий, Д.** Веяния с Запада / Дмитрий Гулецкий // Советская Белоруссия. - 2009. – 15 декабря. - С. 19.

О королеве Боне Сфорца.

**Дранько-Майсюк, Л.**Горад Боны і Давыда : альбомная проза / Леанід Дранько-Майсюк // Дзеяслоў. - 2009. - № 1. – С. 54–58.

**Вайткун, А.** Каралева Бона: міфы і рэальнасць / Аляксей Вайткун // Народная газета. - 2009. – 21 студзеня. - С. 13.

**Марціновіч, А.** Змяя — як сімвал магутнасці / Алесь Марціновіч // Народная трыбуна. - 2005. – 24 снежня ; 31 снежня ; 2006. 6 студзеня ; 14 студзеня ; 21 студзеня ; 28 студзеня.

Аб дзейнасці каралевы Боны Сфорца.

Кобрын
Вялікае Княства Літоўскае
Бона Сфорца
Дзяржаўныя дзеячы
Каралі